# «Лістапад» – гэта толькі пачатак…

**З дзейнасцю студыі «Беларусьфільм» непарыўна звязана ўся гісторыя айчыннага кіно. Фільмы творчага аб'яднання некалі з захапленнем глядзелі мільёны людзей на ўсёй савецкай прасторы. Некаторыя з тых стужак сталі жанравай кінакласікай. Сучасны «Беларусьфільм» імкнецца адпавядаць традыцыям, што заклалі папярэднікі, і развівацца далей. Навіна пра тое, што нацыянальны кінаканцэрн цяпер яшчэ і дырэкцыя XXVII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», яшчэ больш заахвоціла «Беларускую думку» пабываць на айчыннай «фабрыцы мрояў».**

Уласная кінаіндустрыя – вялікая раскоша для любой дзяржавы. Мець яе могуць сабе дазволіць краіны з вялікімі рэсурсамі. Кіно сапраўды вельмі затратны від дзейнасці. Гэта, як вядома, не толькі вытворчасць, але і складаны рынак са сваімі законамі і падводнымі камянямі. Адным словам, сур'ёзны бізнес, дзе добра адчуваюць сябе хіба што «акулы», якія дыктуюць правілы гульні.

– Кінавытворчасць у Беларусі не настолькі развітая, як хацелася б, – звяртае ўвагу генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Уладзімір Карачэўскі. – Наша суверэнная дзяржава ўзяла на сябе сур'ёзную нагрузку – у свой час не пакінула сам-насам з праблемамі, а падтрымала кінастудыю, чыя прадукцыя ў савецкія часы была разлічана на гарантаваны рынак усяго СССР.

Сёння зусім іншая сітуацыя, гаворыць Уладзімір Карачэўскі. Моцная знешняя канкурэнцыя: шмат прыватных кінавытворчасцей, тэлеканалы, інтэрнэт-пляцоўкі. Дзяржаўныя кампаніі перасталі быць манапалістамі ў гэтай сферы.

– Падлічылі, што за апошнія дзесяць гадоў акупнасць кінастудыі складае не больш як 17–20 %, – канстатуе генеральны дырэктар. – Але пры ўсім гэтым мы зберaглі айчынную кінашколу, што вельмі важна для грамадства і культурнага нацыянальнага асяроддзя. І ўсімі сродкамі працягваем яе развіваць.

Паводле слоў Карачэўскага, каб ісці ў нагу з часам, апошнія гады «Беларусьфільм» пры падтрымцы ўлады актыўна займаўся мадэрнізацыяй матэрыяльна-тэхнічнай базы. Павільёны аснасцілі сучасным абсталяваннем.






**Кінадыпламатыя: генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Уладзімір Карачэўскі (справа) падчас сустрэчы з дырэктарам Цэнтра народнай дыпламатыі ШАС ва Узбекістане Кабулжонам Сабіравым**

Шырокі выбар здымачнай тэхнікі дазваляе рэалізоўваць рознага кшталту кінапраекты. На студыі лічаць: не зрабі яны гэта своечасова, само існаванне «Беларусьфільма» было б вялікім пытаннем.

Цяпер жа тут пяць павільёнаў агульнай плошчай каля 4,5 тыс. квадратных метраў, дзе актыўна здымаюць кіно, тэлешоу, відэакліпы. Нядаўна ў самым вялікім з іх для сваіх кліпаў працавалі Ганна Лорак і Сяргей Лазараў, запісвалася забаўляльная тэлепраграма «Х-фактар».

А яшчэ нацыянальная кінастудыя (гэта зусім не сакрэт!) мае вялікі запас арыгінальнай зброі. Як сцвярджае піратэхнік сховішча Генадзь Паліцкавы, арсенал кінакампаніі складае болей як 1360 адзінак стралковай зброі розных эпох, без уліку халоднай і іншай. На складзе галаўных убораў і абутку захоўваецца каля 18 тыс. прадметаў на любы густ. Можна апрануць цэлае войска, прычым розных краін і стагоддзяў. Шмат які рэквізіт аўтэнтычны і мае багатую кінагісторыю. Так, вам

**У адным з павільёнаў «Беларусьфільма»: скончыўся чарговы здымачны дзень**



**Піратэхнік Генадзь Паліцкавы дэманструе багаты арсенал зброі**



абавязкова прадэманструюць важкі кулямёт, з якога чырвонаармеец Сухаў у фільме «Белае сонца пустыні» знішчаў басмачоў. І раскажуць гісторыю пра тое, як здымалі некаторыя эпізоды фільма «Белыя росы», і, канешне, пакажуць гармонік, на якім іграў, седзячы на дрэве ў бусліным гняздзе, Мікалай Карачанцаў. Аказваецца, артыст вельмі баяўся вышыні, да таго ж здымкі ішлі ў нязвыклых умовах, таму музычны інструмент яму змайстравалі лёгкі, з пап'е-машэ. Каб часам не зваліўся разам з гармонікам!

*«Мы збераглі айчынную кінашколу, што вельмі важна для грамадства і культурнага нацыянальнага асяроддзя. І ўсімі сродкамі працягваем яе развіваць».*

На кінастудыі каля 300 штатных супрацоўнікаў, яшчэ дзесьці сотня чалавек у структурным падраздзяленні – тэатры-студыі кінаакцёра. Для кожнага праекта пры неабходнасці бяруць часовых работнікаў.

– Амаль усе зоркі савецкага кіно здымаліся на «Беларусьфільме». У архіве захаваліся іх кінапробы, каля двух тысяч фотаздымкаў, – расказвае Уладзімір Карачэўскі. – Мінулае, традыцыі – гэта добра. Але сёння мы шукаем новыя падыходы да стварэння і мастацкіх, і дакументальных, і анімацыйных фільмаў. І тут немалаважным з'яўляецца пошук запатрабаваных тэм, наяўнасць годных сцэнарыяў.

## Мара пра пульхны сцэнарны партфель…

Не так даўно студыя правяла сур'ёзнае даследаванне: пацікавілася ў аматараў кіно іх прыярытэтамі і пажаданнямі, каб скаардынаваць свае планы і падыходы да вытворчасці кінапрадукцыі. Здаецца, зразумела, чаго чакае глядач і што варта здымаць.

Па-іншаму наладжаны ўвесь творча-вытворчы працэс. Найперш ідэя, потым на конкурснай аснове замаўляецца сцэнарый, пасля калектыўнага зацвярджэння справа рухаецца далей… Сцэнарыяў у партфелі «Беларусьфільма» хапае. Ёсць і камедыі, і меладрамы, і дэтэктывы. Адно што бракуе – якасных сцэнарыяў на тэму Вялікай Айчыннай вайны, патрыятычнага кшталту, таго, чым раней вызначаўся «Беларусьфільм» і што прынесла яму заслужаную славу.

– На жаль, не хапае высокапрафесійных айчынных сцэнарыстаў і рэжысёраў, – наракае Уладзімір Карачэўскі. – У наступным годзе (гэта наша сумесная з Міністэрствам культуры ідэя) арганізуем з Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў праект, у якім паўдзельнічаюць студэнты выпускнога курса тэатральнага факультэта. Трэба шукаць перспектыўных маладых людзей, дапамагаць іх прафесійнаму і творчаму станаўленню.

Тым часам на «Беларусьфільме» кіпіць праца – здымаюць мастацкі фільм «Полымя пад попелам». Кансультуюць здымачную групу прадстаўнікі Міністэрства абароны Беларусі. Падзеі фільма адбываюцца ў розны час. У пасляваенны 1945 год, калі падлеткі ішлі дабравольцамі ў спецыяльна створаныя каманды, займаліся размініраваннем Мінска і ваколіц. І сучасная сюжэтная лінія: унук аднаго з тых пасляваенных сапёраў служыць у супрацьмінным цэнтры. Ён, як калісьці дзед, працягвае вызваляць беларускую зямлю ад небяспечных слядоў мінулай вайны.

У сярэдзіне верасня кінастудыю ў рамках Дзён кіно Узбекістана ў Беларусі наведаў дырэктар Цэнтра народнай дыпламатыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) ва Узбекістане Кабулжон Сабіраў. Візіт быў мэтанакіраваны: «Узбекфільм» плануе сёлета сумесна з беларусамі прыступіць да здымак мастацкага фільма пад назвай «Казбек». Гэта рэальная гісторыя салдата-ўзбека, які ўдзельнічаў у вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, здзейсніў подзвіг і стаў Героем Савецкага Саюза.

– 90 % здымак кінастужкі пройдзе ў Беларусі, – адзначыў падчас візіту К. Сабіраў. – А яшчэ налета плануем фестываль кіно краін – удзельніц ШАС. Таму ў нас цікавасць да Беларусі як краіны, у якой ёсць кінатрадыцыі і творчы патэнцыял.

## …і добрае кіно

На «Беларусьфільме» сцвярджаюць: у айчыннага мастацкага кіно невялікія паводле міжнародных мерак бюджэты – ад 700 тыс. да 1,5 млн долараў на стужку.

*«Налета плануем фестываль кіно краін – удзельніц ШАС. Таму ў нас цікавасць да Беларусі як краіны, у якой ёсць кінатрадыцыі і творчы патэнцыял».*

– Але мы лічым грошы, – заўважае генеральны дырэктар. – Наша пазіцыя – не проста арганізаваць кінапрацэс, які забяспечвае кагосьці працай, а выпусціць запатрабаваны прадукт, найперш беларускім гледачом. Зрэшты, у краіне крыху больш як сотня кіназалаў, і прыбытку без выхаду на знешнія рынкі не атрымаць. Таму імкнёмся здымаць якасныя фільмы, цікавыя для шырокага кола гледачоў.



У чаканні каманды «Матор!»



Натурпляцоўка «Беларусьфільма» ў Смалявіцкім раёне: вёску «пабудавалі» для здымак фільма «Праведнік»

Уладзімір Карачэўскі расказаў, што летась праз пандэмію айчынны кінематограф увогуле не меў ніякіх замоў. Дагэтуль замарожаны буйныя сумесныя праекты «Беларусьфільма» і партнёраў з Індыі, Кітая. Гэта вымусіла кінастудыю прытрымаць, не накіроўваць у пракат некаторыя фільмы – навінкі апошняга часу. Некаторыя закансервавалі. Свайго часу ў шырокім пракаце чакае «Янка Купала». А вось гісторыка-прыгодніцкі фільм «Авантуры Пранціша Вырвіча» можна пабачыць ужо напрыканцы года, прычым у дзвюх моўных версіях – беларускай і рускай.

***«Наша пазіцыя – не проста арганізаваць кінапрацэс, які забяспечвае кагосьці працай, а выпусціць запатрабаваны прадукт, найперш беларускім гледачом».***

Сумесны беларуска-расійскі прыгодніцкі ваенны фільм «Лёс дыверсанта», які ў маі прэзентавалі ў некаторых рэгіёнах Беларусі і Расіі, рыхтуецца да продажу аднаму з вядучых расійскіх тэлеканалаў. Серыялам «Сляды апосталаў – 2» таксама зацікавіліся расіяне. Зусім нядаўна на тэлеканале СТБ прайшоў прэм'ерны паказ маладзёжнага серыяла «Ілюзіі», а ў чэрвені беларускай кінапубліцы прэзентавалі першы поўнаметражны беларускі анімацыйны мюзікл «Зоркі сёмага неба».

Геаграфія пракату новых фільмаў таксама пашыраецца. Кіраўніцтва «Беларусьфільма» падпісала дагаворы на продаж айчыннай кінапрадукцыі з шэрагам замежных дыстрыб'ютараў, найперш расійскіх. Хутка падобныя падпішуць з партнёрамі з Азіі.

## Цэнтр кінажыцця краіны?

На «Беларусьфільме» захавалася вялікая кінабібліятэка. Сёння ідзе інвентарызацыя, вяртанне выключных маёмасных правоў на стужкі, некалі знятыя кінастудыяй, праводзіцца рэстаўрацыя старых фільмаў – якаснае рэтра нядрэнна прадаецца за мяжу.

– Мы арыентуемся не толькі на рускамоўнага гледача, – расказвае гендырэктар кінастудыі. – Прадалі беларускія фільмы нават у Паўночную і Паўднёвую Карэі, у Японію, Злучаныя Штаты, у шэраг еўрапейскіх краін.

З 2018 года аб'яднанне рэалізуе новы праект – кінатурызм. Пакуль што гэта экскурсіі. Але нядаўна «Беларусьфільм», Дэпартамент па турызме Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальны гістарычны музей і сталічны «Кінавідэапракат» падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве: у перспектыве запрацуе вялікая кінаэкскурсія па Мінску.

– Яна будзе пачынацца каля чыгуначнага вакзала. Наступная кропка маршруту – Музей гісторыі беларускага кіно, потым праспект Незалежнасці, кінастудыя і натурная пляцоўка, – дзеліцца планамі Уладзімір Карачэўскі. – Лакацый прадугледжана шмат.



**Расійскі рэжысёр Сяргей Урсуляк на пляцоўках «Беларусьфільма» здымае стужку «Праведнік»: рабочая сустрэча з Уладзімірам Карачэўскім**

Кіраўнік студыі падкрэслівае: «Беларусьфільм» паступова пашырае свае магчымасці, імкнецца быць у цэнтры найважнейшых кінападзей. Адным з такіх крокаў стала падрыхтоўка да XXVII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», гэтым разам – у якасці дырэкцыі. І дадаў, што зараз на натурпляцоўцы ў Смалявіцкім раёне здымае новы фільм расійскі рэжысёр, аўтар знакамітага серыяла «Ліквідацыя» Сяргей Урсуляк – актыўны ўдзельнік мінскага кінафестывалю.

***«Больш за 50 краін далі згоду на ўдзел у фестывалі, заяўлена ўжо каля 300 фільмаў».***

– У Беларусі я ўжо быў неаднойчы: і як удзельнік, і як член, і як старшыня журы «Лістапада», – падзяліўся з намі рэжысёр. – А здымаю на беларускай зямлі ўпершыню. Умовы для маёй групы камфортныя, усё падпарадкавана працы. А што да «Лістапада», я вельмі добра да яго стаўлюся, так што з задавальненнем прыеду.

Падрыхтоўка да свята кіно, якое пройдзе ў Мінску з 20 па 26 лістапада, ідзе поўным ходам. Сёлета фестываль парадуе асноўнымі конкурснымі праграмамі гульнявога, дакументальнага, маладзёжнага кіно і конкурсам фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторы «Лістападзік». Апроч таго, пройдуць паказы пазаконкурснай праграмы «Кіно сяброў», гэта работы партнёраў «Беларусьфільма», а таксама рэтраспектыўны паказ фільмаў знакамітага беларускага рэжысёра Віктара Турава да яго 85-годдзя.

– Падрыхтоўка фестывалю знаходзіцца ў руках вопытных спецыялістаў. Адна з галоўных тэм форуму – гуманізм у кіно. Ідзе фарміраванне конкурснай праграмы. Больш за 50 краін далі згоду на ўдзел у фестывалі, заяўлена ўжо каля 300 фільмаў, – каментуе Уладзімір Карачэўскі.

На думку кіраўніка «Беларусьфільма», для кінастудыі гэта толькі пачатак вялікай і адказнай працы, каб у перспектыве стаць кластарам, які аб'ядноўвае на сваёй пляцоўцы ўсіх кінематаграфістаў, вырасці да натхняльніка і арганізатара кінападзей у краіне і не толькі. Уладзімір Карачэўскі не выключае таксама, што фестываль не толькі застанецца сапраўдным святам, але і будзе актыўнай і эфектыўнай пляцоўкай сусветнага кінарынку.

***Леанід КРЫВАНОС***
***Фота Паўла АРЛОЎСКАГА***